# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

*К. В. Андрэйчык*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк

*K. Andreichyk*
Polotsk State University, Polotsk

**УДК 94(477.74):351.853**

## ЗАХАВАННЕ І АДРАДЖЭННЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ГОРАДА ВІЦЕБСКА Ў 1991–2001 ГГ.

## PRESERVATION AND REVIVAL OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF VITEBSK, IN THE 1991–2001

*Артыкул прысвечаны аналізу асноўных напрамкаў дзейнасці дзяржаўных органаў і ўстаноў горада Віцебска па захаванню і адражэнню гісторыка-культурнай спадчыны ў перыяд з 1991 па 2001 гг. Важнымі крокамі на гэтым шляху стала распрацоўка і рэалізацыя праграмных дакументаў, а таксама праца Камісіі па адраджэнні і захаванні гістарычнай спадчыны Віцебска, дзейнасць гарадской тапанімічнай камісіі, наладжванне міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай сферы і інш.*

*Ключавыя словы: Віцебск; помнікі; гісторыка-культурная спадчына; даследаванне спадчыны; заканадаўства.*

*The article analyzes the main directions of activities of state bodies and institutions of the city of Vitebsk for the conservation and Adrianna historical and cultural heritage in the period from 1991 to 2001, an Important step in this direction was the development and implementation of policy documents and the work of the Commission on the revitalization and preservation of the historical heritage of Vitebsk, the activities of the city toponymic Commission, international cooperation.*

*Key words: Vitebsk; monuments; historical and cultural heritage; research heritage; legislation.*

Складаны і супярэчлівы перыяд апошняга дзесяцігоддзя XX ст., звязаны з этапам станаўлення нацыянальнай сістэмы аховы гісторыка-культурных помнікаў у Рэспубліцы Беларусь, у справе вывучэння айчыннай гісторыка-культурнай спадчыны, застаецца адным з маладаследаваных, але маючых вырашальнае значэнне нават для сённяшняга дня. Актывізацыя інтарэсу і трансфармацыя стаўлення да помнікаў уласнай гісторыі і культуры з’яўляецца сведчаннем росту духоўнага ўзроўню беларускага грамадства і сталення беларускай дзяржаўнасці. У гэты перыяд асаблівае значэнне набывае ў гэтай сферы дзейнасць органаў улады, устаноў і арганізацый па захаванні і трансляцыі шматвекавой гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Пэўныя меры па адраджэнні і захаванні аб’ектаў спадчыны выступаюць як механізмы трансляцыі, спрыяюць распаўсюджванню ведаў аб гісторыі краіны і яе асобных рэгіёнаў, фарміраванню нацыянальнага светапогляду, заснаванаму на агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцях, культурных традыцыях беларускага народа, адлюстроўвае супольныя інтарэсы ў гэтай сферы асобы, грамадства і дзяржавы.

Віцебск з'яўляецца адным са старажытнейшых гарадоў Беларусі, мае багатую гісторыю і культурныя традыцыі. Сёння горад пазіцыянуе сябе як цэнтр выяўленчага мастацтва, працягвае лепшыя традыцыі, закладзеныя яшчэ такімі выдатнымі дзеячамі, як М. Шагал, А. Бембель, С. Селіханаў, В. Кароль і інш. Вялікая праца па захаванні і аднаўленні гісторыка-культурных каштоўнасцей у горадзе вядзецца ў апошняе дзесяцігоддзе. Але працы ў гэтым кірунку былі распачатыя яшчэ ў першае дзесяцігоддзе незалежнасці Беларусі. У перыяд 1991–2001 гг. у Віцебску былі зроблены значныя крокі па аднаўленні страчаных помнікаў, вяртанні забытых імёнаў і памяці пра гістарычныя падзеі. Дзейнасць мясцовых органаў улады, устаноў і арганізацый – гэта базавая і найбольш дзейная форма рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы, захавання, трансляцыі і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Рэалізацыя мерапрыемстваў па гэтых напрамках у горадзе ў першую чаргу была пакладзена на аддзел культуры выканкама Віцебскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Першаснае значэнне мела прыняцце праграмных дакументаў, стварэнне профільных структурных адзінак – камісій і спецыялізаваных сектараў аховы помнікаў гісторыі і культуры.

У 1991 г. аддзелам культуры Віцебскага гарвыканкама была прынята Праграмма асноўных напрамкаў дзейнасці ўстаноў культуры горада па адражэнні нацыянальнай культуры і ўмацаванні яе матэрыяльна-тэхнічнай базы. Праграмма была разлічана на перыяд з 1991 па 2000 гг. і ўключала працу ў наступных кірунках: стварэнне і дзейнасць гарадской камісі па адраджэнні і захаванні гістарычнай спадчыны Віцебска; мерапрыемствы, звязаныя з аховай і папулярызацыяй беларускай нацыянальнай культуры; мерапрыемствы, звязаныя з ушанаваннем памяці знакамітых землякоў, гістарычных падзей, выданне часопісаў па пытаннях культуры і мастацтва, садзейнічанне развіццю гісторыка-краязнаўчай працы (у т.л. актывізацыя збору матэрыялаў для выдання серыі кніг «Памяць») [1, л. 3; 2, л. 7].

У 1992 г. пры аддзеле культуры і інфармацыі Віцебскага гарвыканкама ў адпаведнасці з Праграмай была ўтворана камісія па адраджэнні, захаванні і развіцці культурнай і гістарычнай спадчыны. Сярод яе членаў былі прадстаўнікі выканаўчых органаў, будаўнічых і рэстаўрацыйных арганізацый, супрацоўнікі музеяў, прадстаўнікі жыллёва-камунальнай сферы. Пасяджэнні камісіі адбываліся некалькі разоў на год. Камісія складалася з 21 асобы, у яе склад уваходзілі: старшыня В. У. Акуневіч, намеснік старшыні камісіі – загадчык аддзела культуры В. Д. Кібісаў, галоўны архітэктар горада В. В. Дубік, адказны сакратар гарадскога аддзялення таварыства аховы помнікаў С. С. Аборын, намеснік старшыні прэзідыума абласнога савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Н. А. Сулецкая, археолаг праектна-рэстаўрацыйных майстэрняў «Белрэстаўрацыі» І. А. Цішкін, гісторык праектна-рэстаўрацыйных майстэрняў «Белрэстаўрацыі» Л. В. Хмяльніцкая, дацэнт кафедры педагогікі педагагічнага інстытута М. С. Рыўкін і інш. [1, л. 7; 2, л. 8].

Сярод пытанняў, якія знаходзіліся ў кампетэнцыі камісcіі, былі наступныя: вяртанне ранейшых гістарычных назваў плошчам горада, вуліцам, аўтобусным прыпынкам і інш., удасканаленне практыкі прысваення назваў прадпрыемствам, арганізацыям, установам, захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны, ушанаванне памяці знакамітых землякоў, гістарычных падзей і інш. Так, вынікам працы камісіі стала перайменаванне шэрагу вуліц горада: у 1992 г. была вернута ранейшая назва вуліцы Пакроўскай – былой вул. Дзяржынскага; музычнаму вучылішчу прысвоена імя музыказнаўцы І. І. Салярцінскага [1, л. 3; 2, л. 7] і інш.

21 мая 1992 г. гарвыканкамам было прынята рашэнне № 200 «Аб стане і мерах па далейшым утрыманні помнікаў у гістарычнай частцы горада». У адпаведнасці з ім аддзел культуры, выконваючы ўмовы палажэнняў Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, утварыў у сваім штатным раскладзе 2 адзінкі пастаянных спецыялістаў па ахове помнікаў. Разам з тым у снежні 1993 г. пры аддзеле культуры быў утвораны сектар па ахове помнікаў архітэктуры і археалогіі, задачамі якога былі арганізацыя і кантроль за ўлікам і аховай помнікаў усіх відаў, арганізацыя і правядзенне навуковых і ахоўных археалагічных даследаванняў і мерапрыемстваў у гістарычнай частцы горада, падрыхтоўка па выніках даследаванняў актаў тэхнічнага стану нерухомых каштоўнасцяў, вызначэнне парадку аб'ектаў, якія падлягалі першачарговай рэстаўрацыі і капітальнаму рамонту, унясенне прапаноў па гаспадарчым выкарыстанні помнікаў архітэктуры ў адпаведнасці з іх гістарычнай каштоўнасцю, па ўдасканаленні іх катэгарыйнасці і інш. Кантралюючым органам выступала Дзяржаўная інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (ДзІнАС). У снежні 1993 г. адбылося зацвярджэнне ахоўных абавязацельстваў, згодна з якімі аддзел культуры павінен быў праводзіць пераафармленне ахоўнай дакументацыі з уласнікамі і арандатарамі помнікаў архітэктуры. Да снежня 1994 г. працэдура была амаль выкананая. У выпадку выяўлення помніка, які ўяўляў сабой каштоўнасць, уласнік або арандатар павінен быў правесці рэстаўрацыйныя работы за асабісты кошт альбо страчваў права арэнды ці ўласнасці [3, л. 23].

У рамках ажыццяўлення Праграмы будаўніцтва, рэканструкцыі і капітальнага рамонту ў перыяд з 1991 па 2000 гг. планавалася правядзенне раскопак і рэстаўрацыі руінаў Дабравешчанскай царквы (адноўлена ў 1998 г.), планавае правядзенне першай чаргі рэгенерацыі гістарычнай часткі вул. Л. Талстога, Я. Купалы, У. Леніна; правядзенне раскопак і рэстаўрацыі ў Васкрасенскай царкве (адноўлена ў 2009 г.); рэканструкцыя помніка архітэктуры XIX ст. «Духаўскі круглік» ці кансервацыя рэштак з мэтай экспазіцыі (рэканструяваны ў 2007 г.). У 1996–1997 гг. планавалася распачаць працы па Успенскім саборы, Аляксееўскім манастыры (колішнім іезуіцкім кляштары); у 1994–1995 гг. – правесці капітальны рамонт пл. Перамогі, аднак планы засталіся толькі на паперы, рэканструкцыя адбылася толькі ў 2009–2010 гг., тады ж адбылося і добраўпарадкаванне поймы ракі Віцьбы ў раёне

могілак ахвяр фашызму, замена абеліска на брацкіх магілах савецкіх воінаў і партызан па вул. Ленінградскай [5, л. 45–47].

Паказчыкам паспяховасці ў ажыццяўленні праграмных мерапрыемстваў можна лічыць колькасць помнікаў, якія падлягалі ахове (табл. 1).

*Табліца 1*

**Колькасць помнікаў гісторыі і культуры мясцовага значэння ў г. Віцебску ў перыяд з 1988 па 1990 гг. і з 1991 па 1992 гг. [5, л. 45–47]**

| Тып помніка | Гады | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1988 | 1989 | 1990 | 1991 | 1992 |
| Помнікі археалогіі | 315 | 312 | 297 | 306 | 306 |
| Помнікі гісторыі | 1939 | 1981 | 1980 | 1975 | 1851 |
| Помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва | 164 | 382 | 382 | 380 | 372 |
| Помнікі мастацтва | 10 | 12 | 12 | 12 | 10 |

Параўноўваючы і аналізуючы прыведзеныя этапы наяўнасці помнікаў гісторыі і культуры мясцовага значэння пачынаючы з 1988–1998 гг. і з перыядам 1991–1992 гг., можна падсумаваць, што апошні перыяд характарызуецца змяншэннем колькасных паказчыкаў, што абумоўлена зняццем з уліку асобных помнікаў па прычыне іх зносу, самавольнай перабудовы без захавання аўтэнтычных рыс, камерцыялізацыі і прыватызацыі.

Выконваючы рашэнне гарвыканкама № 128 ад 24.03.1994 г. «Аб археалагічных раскопках у гістарычнай частцы горада», аддзел культуры распачаў даследаванні культурнага слою. Службы і арганізацыі, зацікаўленыя ў правядзенні будаўніцтва, і тыя, хто меў намер правядзення земляных работ, узгаднялі іх з сектарам аховы помнікаў і археалогіі, усе працы выконваліся за ўласны кошт. Аднак мела месца невыкананне арганізацыямі ахоўных абавязацельстваў. Так, ВТУ сувязі самавольна правялі будаўнічыя працы і тым самым знішчылі культурны слой. Справу разглядала пракуратура [6, л. 34–35].

У 1992–1997 гг. упраўленнем культуры аблвыканкама ў Віцебску планавалася адкрыць шэраг музеяў і выставачных залаў. У адпаведнасці з праграмным дакументам па папулярызацыі дзейнасці прафесійных калектываў і дзеячаў мастацтва мінулага і сучаснасці перад упраўленнем ставіліся наступныя задачы: адкрыццё музея-сядзібы «Здраўнёва», музея прыватных калекцый, мастацкага і літаратурнага музеяў [1, л.17].

У перыяд з 1992 па 1994 гг. планавалася адкрыць музей-сядзібу І. Рэпіна «Здраўнёва». Адкрыццю музейнай экспазіцыі папярэднічала дасканалая навуковая, а таксама праектная дзейнасць, таму што ад рэпінскіх часоў захаваліся толькі рэшткі скляпенняў, падмуркі дома, перасохлая сажалка, ліпавая алея і асобныя дрэвы парку. Захады з мэтай аднаўлення сядзібы рабіліся яшчэ з 1982 г., калі былі распрацаваны генеральны план і выраблена поўная рабочая дакументацыя. Напярэдадні адкрыцця музея была праведзена канфе-

рэнцыя ў гонар 150-годдзя з дня нараджэння мастака. Пры рэканструкцыі сядзібы былі выкарыстаны навуковыя артыкулы Д. Яцкевіча «Матэрыялы, звязаныя з І. Я. Рэпіным, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь» і Я. Тэркель «І. Я. Рэпін і Здраўнёва». У апошнім знаходзіліся фатаграфіі «Сад у Здраўнёве», «Дом І. Я. Рэпіна ў Здраўнёва», «Уборка жыта ў Здраўнёва» і іншыя каштоўныя матэрыялы. Аднак у 1995 г. музей быў значна пашкоджаны падчас пажару [11, с. 43–44].

Яшчэ адным яскравым прыкладам музеефікацыі культурнай прасторы горада Віцебска ў гэты перыяд стала адкрыццё музейнага комплексу М. Шагала па вул. Пакроўскай і вул. Савецкай. У часы БССР імя майстра было несправядліва забыта. У 1991 г. Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэтам было прынята рашэнне аб стварэнні ў Віцебску музея М. Шагала, для якога перадалі будынак выставачнага цэнтра. Тады ж пад кіраўніцтвам А. Падліпскага была адкрыта экспазіцыя ў адным з пакояў дома на вул. Пакроўскай. На працягу наступных гадоў на сродкі Віцебскага гарвыканкама пры ўдзеле «Кола садзейнічання «Дому-музею Шагала ў Віцебску» г. Нінбурга (ФРГ, Ніжняя Саксонія) была праведзена рэстаўрацыя бацькоўскага дома. У адпаведнасці са сметай ад 1992 г. на спецыяльныя навукова-даследчыя і праектна-сметныя работы па рэстаўрацыі помніка архітэктуры з прыстасаваннем пад музей памер коштаў склаў 92 235 руб. Правядзенне рэстаўрацыі прадугледжвала наступныя напрамкі работ: падрыхтоўка гістарычнай спраўкі, гісторыка-архіўныя даследаванні, архітэктурна-археалагічныя абмеры помніка першай катэгорыі складанасці, закладванне зандажоў і шурфоў, інжынернае даследаванне помніка, састаўленне эскізнага праекта і інш. Такім чынам, найбольш затратнымі сталі гісторыка-архіўныя даследаванні (кошт 5012 руб.), архітэктурна-археалагічныя абмеры (кошт 7596 руб.) і распрацоўка дакументацыі па прыстасаванні помніка архітэктуры для патрэб музея (35 403 руб.). Фінансаванне рэканструкцыі помніка адбылося пры ўдзеле нямецкага грамадскага аб’яднання «Кола садзейнічання «Дому-музею Шагала ў Віцебску» з г. Нінбург. Значны ўнёсак у справу вяртання творчай спадчыны Шагала на радзіму таксама зрабілі замежныя даследчыкі і родзічы мастака. Урачыстае адкрыццё музея М. Шагала адбылося 6 ліпеня 1997 г. у год 110-годдзя з дня нараджэння мастака пры падтрымцы замежнага аб’яднання «Кола садзейнічання» [10, с. 54].

У адпаведнасці з задачай па ўвекавечванні імёнаў выдатных беларускіх дзеячаў былі ўстаноўлены мемарыяльныя знакі і дошкі ў гонар М. Я. Нікіфароўскага, заснавальніку музейнай справы ў Віцебску, аўтару навуковых прац па старажытнай архітэктуры і горадабудаўніцтву Беларусі У. Г. Краснянскаму, народнаму мастаку СССР З. І. Азгуру [1, л. 24].

З 1994 г. распачаліся працы па адраджэнні традыцыйных рамёстваў і промыслаў, праграмныя дакументы ў гэтай сферы прадугледжвалі выяўленне і падтрымку майстроў народнай творчасці і самадзейных мастакоў, стварэнне аб’яднанняў па традыцыйных рамёствах. Акрамя таго, увага надавалася

і прапагандзе творчасці прафесійных дзеячаў культуры і мастацтва мінулага і сучаснасці [1, л. 28].

З лютага 1998 г. пры аддзеле культуры Віцебскага гарвыканкама пачала сваю дзейнасць тапанімічная камісія, у склад якой уваходзіла 8 членаў: Б. В. Лядэнка, І. Р. Герасімаў, В. М. Кунцэвіч, М. Я. Ізафатаў, А. А. Маркоўскі, В. М. Ціценка, Р. А. Чумакова, Л. С. Якаўлеў. Старшынёй быў абраны Б. В. Лядэнка. Склад удзельнікаў быў зацверджаны рашэннем гарвыканкама ад 29.01.1998 г. «Камісія займалася перайменаваннем вуліц, найменаваннем новых вуліц у раёнах навастроек, а таксама на далучаных да горада тэрыторыях, аўтобусных прыпынкаў і інш. Прымаліся рашэнні аб увекавечанні памяці аб выдатных дзеячах культуры і мастацва, абаронцах горада і інш. У адпаведнасці з пастанаўленнем № 1238 ад 03.08.1998 г. «Аб зацвярджэнні нарматыўных актаў для рэалізацыі закона “Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле і парадку рашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Рэспублікі Беларусь”» прысваенне назваў аб’ектам адбывалася з улікам геаграфічных, гістарычных, нацыянальных, побытавых і іншых мясцовых умоў. Аб’ектам маглі давацца найменаванні, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, а таксама імёнамі выдатных дзеячаў. Канчатковае рашэнне ўсё ж было за гарвыканкамам. Прапановы прымаліся ад працоўных калектываў, жыхароў горада, ветэранаў вайны, устаноў адукацыі, культуры, рэлігійных абшчын, а таксама ваеннага ведамства. Так, ад Віцебскага гарнізона на разгляд камісіі паступіла пытанне аб назве вуліцы ў гонар Героя Грамадзянскай вайны І. С. Куцякова. Члены камісіі падрыхтавалі гістарычную даведку, згодна з якой прынялі рашэнне ў прапанове адмовіць, бо І. С. Куцякоў не з’яўляўся ні ўраджэнцам Віцебска, ні Віцебшчыны і не меў асабістых заслуг перад горадам. У 2001 г. на пасяджэнні тапанімічнай камісіі разглядалася пытанне аб найменаванні назвай «Ніжні замак» аўтобуснага прыпынку каля амфітэатра. Камісія не падтрымала такую прапанову, абгрунтаваўшы гэта тым, што на мясцовасці дадзены аб’ект не фігуруе і будзе толькі блытаць жыхароў і гасцей горада, аднак была абмеркавана прапанова вярнуцца да гэтага пытання, калі будзе адноўлена вежа «Духаўскі круглік» («Нарожная»), якая была рэканструявана ў 1997 г. [ 2, л. 12]

Такім чынам, адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны горада Віцебска ў 1991–2001 гг. адбывалася ў адпаведнасці з прынятай Праграмай асноўных напрамкаў дзейнасці ўстаноў культуры горада па адраджэнні нацыянальнай культуры і ўмацаванні яе матэрыяльна-тэхнічнай базы, якая прадугледжвала аднаўленне і рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры, мемарыялізацыю імёнаў вядомых жыхароў і ўраджэнцаў г. Віцебска, адкрыццё музеяў і інш. Дзейнасць камісій і сектара па ахове помнікаў і археалогіі стала крокам на шляху вяртання страчаных помнікаў, аднаўлення і аховы існуючых, такіх як сядзіба І. Рэпіна «Здраўнёва», бацькаўскі дом М. Шагала. Мерапрыемствы па захаванні гістарычнай часткі горада прадугледжвалі

не толькі рэстаўрацыйныя работы, але і поўнае аднаўленне помнікаў архітэктуры. Так, да іх ліку адносяцца Васкрасенская царква, Духаўскі круглік і інш. Разам з тым аднаўленчыя работы над шэрагам аб'ектаў былі зацягнуты (рэканструкцыя Плошчы Перамогі) ці нават не распачаты. Найменаванне і перайменаванне вуліц і іншых геаграфічных аб'ектаў адбывалася ў Віцебску толькі пасля дасканалага вывучэння звестак аб заяўленых асобах, былых назвах і ў адпаведнасці з нарматыўна-прававымі актамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 29.
2. ГАВО. – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 33.
3. ГАВО. – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 111.
4. ГАВО. – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 15.
5. ГАВО. – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 169.
6. ГАВО. – Ф. 2222. – Оп. 5. – Д. 170.
7. ГАВО. – Ф. 2852. – Оп. 5. – Д. 45.
8. ГАВО. – Ф. 2852. – Оп. 5. – Д. 86.
9. *Хмельницкая, Л.* Витебск за один день / Л. Хмельницкая. – Минск: Рифтур, 2016. – 84 с.
10. *Хмельницкая, Л.* Марк Шагал и Витебск / Л. Хмельницкая. – Минск: Рифтур, 2013. – 94 с.
11. *Шышанаў, Л. С.* Здраўнёва. Гістарычнае аблічча і музеефікацыя сядзібы. / Л. С. Шышанаў // Матэрыялы I Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі ўнікальных гістарычных тэрыторый ды грамадскасці і кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь. – Полацк, 1998. – С. 89–92.


**(Дата падачы: 08.02.2018 г.)**


*М. М. Атрушкевич*
Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск
*M. M. Atrushkevich*
Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk


**УДК 947.083(476)**

# ОБЩАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА ГОРОДОВОГО ПОЛОЖЕНИЯ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ 1892 Г. И ЕГО ПОСЛЕДСТВИЯ

# GENERAL CHARACTERISTICS OF THE CITY STATE OF THE RUSSIAN EMPIRE 1892 AND ITS IMPLICATIONS

*Статья посвящена изучению изменений в городском законодательстве Российской империи в 90-е гг. XIX в. В ней идет речь об особенностях реализации Городового положения 1892 г. на территории Беларуси в данный период. Автор статьи раскрывает основные положения данной городской реформы, действовавшей в белорусских городах в конце XIX в., а также делает сравнительный анализ городской реформы 1892 г. с городской реформой 1870 г.*